Год гістарычнай памяці

# Іх было 18 герояў-партызан,

## альбо «Нашы байцы змагаліся да апошняга...»



**Сёлета 3 снежня адзначаецца 80-годдзе Лаўскага бою — адной з найярчэйшых старонак партызанскага руху ў Беларусі, бессмяротнаму подзвігу народных мсціўцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.**

У мемуарах «Вечный огонь. Партизанские записки» камандзір мінскага партызанскага злучэння Герой Савецкага Саюза палкоўнік Раман Навумавіч Мачульскі адзначыў, што на пачатку снежня 1942 года вораг распачаў чарговую карную экспедыцыю. Наступленне ішло з боку Капыля.

Каб затрымаць праціўніка, партызаны вырашылі зрабіць засаду. Для гэтага ў вёску Клецішча накіраваліся 18 добраахвотнікаў на чале з **камандзірам узвода В. І. ДРАЗДОВІЧАМ.**

Вікенцій Іосіфавіч нарадзіўся ў 1911 годзе ў вёсцы Навасёлкі Капыльскага раёна ў сям'і батрака. У 1936-м быў прызваны ў Чырвоную Армію, служыў у кавалерыйскім палку. Пасля службы працаваў калгаснікам, старшынёй сельсавета...

Сярод добраахвотнікаў былі Васіль Астрэйка з Капыльшчыны, у якога фашысты па-зверску замучылі маці, неразлучныя сябры-кулямётчыкі — 20-гадовы Дзмітрый Цітко і 19-гадовы Павел Лыч, Міхаіл Дзесюкевіч і Іван Тумілові ч з УзДзеншчыны, Іван Жыгалковіч і Сяргей Духанаў з Дзяржыншчыны... Самым малодшым у групе быў 15-гадовы Уладзімір Качаноўскі.

Група з 18 чалавек залегла на могілках і, падпусціўшы ворага на блізкую адлегласць, адкрыла агонь.

Фашысты не чакалі нічога падобнага і таму спачатку адступілі, пакідаючы на полі дзясяткі забітых, а трохі пазней адкрылі ўраганны артылерыйскі агонь па могілках, з двух бакоў сталі абыходзіць засаду. Атакі немцаў паўтараліся... Змоўк адзін з партызанскіх кулямётаў, палова смельчакоў загінула, у астатніх заканчваліся патроны.

Аб гэтым камандзір узвода В. І. Драздовіч адправіў у атрад данясенне, аднак прыйсці смельчакам на выручку партызаны не змаглі, бо засада была ў чыстым полі, і немцы напіралі з усіх бакоў.

Адступаць героям таксама не выпадала: карнікі акружылі могілкі.

Нашы байцы змагаліся да апошняга патрона, потым пусцілі ў ход гранаты, а ўрэшце тыя, хто выжыў, пайшлі ўрукапашную...

Усе 18 герояў загінулі, але знішчылі 85 гітлераўцаў і на паўдня затрымалі фашыстаў каля вёскі Клецішча, што дазволіла партызанам дабіцца поспехаў на іншых участках і ў бяспечнае месца вывезці шпіталь.

...У партызанскім рукапісным часопісе была змешчана песня пра Лаўскі бой, дзе ёсць такія словы:

*Не забудем вас, героев-братьев,*
*Что в засаде дрались, как орлы.*
*Слава вам, народные герои —*
*Партизанские богатыри!*



Гэтай гераічнай старонцы прысвяцілі свае творы беларускія паэты Анатоль Астрэйка, Адам Русак і іншыя. Лаўскі бой увекавечаны і на карціне народнага мастака СССР Міхаіла Савіцкага.

Загадам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Вікенцію Іосіфавічу Драздовічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, яго імем названы вуліцы ў Мінску і аграгарадку Лясны, у цэнтры якога ўсталяваны бюст герою. Іншыя партызаны пасмяротна ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені. Фотаздымкі і дакументы герояў захоўваюцца ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

**Мікалай Шаўчэнка,**
*г. Мінск.*

Дзейныя асобы

# МЭТА АДНА — СЛУЖЫЦЬ КУЛЬТУРЫ

**«Не шукай ты шчасця, долі на чужым, далёкім полі», — пісаў любімы Купала. І вельмі многія з яго чытачоў сапраўды не шукалі.**
**Надзея Уладзіміраўна Кожар з маленства жыла на Расоншчыне, амаль трыццаць гадоў працавала ў тутэйшым музеі баявой садружнасці. Яго экспанаты і дакументы — часам горкія, часам узнёслыя — сілкавалі яе любоў да людзей, шчырае захапленне мінулым сваёй Радзімы, якім так хацелася падзяліцца з іншымі! Працуючы ў музеі, Надзея Уладзіміраўна мела такую магчымасць і шчодра перадавала свае глыбокія веды, паспяхова дэманструючы пры тым і знаходлівасць, і такт, і, вядома ж, валоданне словам.**

Першыя вершы на памяць малая Надзейка чытала яшчэ стоячы на табурэтцы — для сваіх сямейнікаў, для гасцей... Потым, з гадамі, прыйшло жаданне нешта напісаць самой, даслаць у рэдакцыю раённай газеты. Менавіта з яе старонак загучаў спачатку нясмелы, а потым усё больш упэўнены голас творцы: «Жыві, квітней, Айчына дарагая, // Ідзі насустрач сонечнаму дню, // Ад сэрца вершы я табе складаю, // Пяю тваю дзівосную вясну...»

У творчым набытку ў Надзеі Кожар безліч прыгожых вершаў, бо яна не толькі паэт, але і прыроджаны, можна сказаць, дэкламатар. Прынамсі, калі са сцэны ў яе выкананні гучыць паэма Міколы Нагнібеды «Расонскім маці», многім не ўдаецца стрымаць слёзы. А таму не дзіва, што прозвішча Кожар часта сустракаецца сярод пераможцаў многіх рэспубліканскіх і нават міжнародных літаратурных конкурсаў.

Адзін з адносна нядаўніх, арганізаваны часопісам «Маладосць» і Першым нацыянальным каналам беларускага радыё, стаў для Надзеі Уладзіміраўны ці не самым памятным. Праходзіў ён цягам усяго 2019 года. Па выніках кожнага месяца журы вызначала пераможцаў, потым тактоўна і добразычліва абмяркоўвала іх творы на радыё, а часопіс «Маладосць» даносіў да чытача...



Выніковае мерапрыемства конкурсу «Бацькаўшчына светлая мая», з запрашэннем у Мінск пераможцаў і фіналістаў адбылося ў Доме радыё. Нашу Расоншчыну на гэтай урачыстасці прадстаўлялі трое... І сярод іх — Надзея Кожар: першае месца ў намінацыі «Эсэ».

Творчасць пераможцы высока ацаніў паэт, перакладчык, старшыня журы конкурсу Мікола Мятліцкі. На яго думку, у творах Надзеі Кожар адчуваецца глыбіня таленту, эмацыянальнасць, пранікнёнасць, гістарычная заглыбленасць, здольныя зачароўваць і кранучь сэрца кожнага.

...І нельга сказаць, што ўсё гэта — ужо ў мінулым. Нават на так званым заслужаным адпачынку Надзея Уладзіміраўна не супакоілася: яна паспела выдаць сваю досыць аб'ёмную кнігу «С любовью к Россонщине» (на дзвюх мовах), плённа пакіраваць клубам самадзейных паэтаў, напісаць і паставіць (не толькі на раённай сцэне) дзве п'есы «Вячоркі ў шляхціца Завальні» і «Серебряного века волшебство», да паказу рыхтуецца вадэвіль Надзеі Уладзіміраўны «Вечарына ў маёнтку».

Такім чынам, яна па-ранейшаму служыць: служыць людзям, прымушаючы іх задумацца над напісаным, абудзіць пачуцці, данесці мастацкае слова да самай шырокай аўдыторыі — чытачоў і слухачоў, служыць культуры.

...Вось такая наша Надзея: прыклад дабрыні, шчырай любові да сваёй зямлі.

**Аляксандр Матошка,**
*Расонскі раён.*

Перажытае — незабытае

# «Нічога каштоўнага ў нас не знайшлі»

**Гэтую рэч я помню да драбніц, бо яна была фантастычна прыгожай! Вялікая, колеру спелага мандарына, з букетамі руж, з махрамі па ўсім перыметры, з кутасамі на кожным ражку. Любата, а не хустка! Бабуля атрымала яе ў пасаг ад сваёй матулі і з такім імпэтам насіла...**

Насіла, як водзіцца, спачатку сама, потым, калі стала падбірацца пад дзеўку, давала мне — прыбрацца на танцы, пафарсіць, прычым з нязменным наказам: «Глядзі ж... Гэта хустка вельмі дарагая... Калі хочаш, раскажу яе гісторыю», — прапанавала аднойчы бабуля. І я, вядома ж, згадзілася, думала, што пачую нешта чароўнае, але...

«Калі пачалася вайна, — задуменна прамовіла бабуля, гледзячы не тое ў акно, не тое ў сваё мінулае, — мне было трыццаць два гады. Я ў гэтым узросце ўжо ўдава, у мяне на руках трое малых, а вёска наша, як тады казалі, пад немцамі...

І не проста на захопленай тэрыторыі, — у нас, у Радкаве, нейкі час размяшчаўся фашысцкі гарнізон. А калі ён перабраўся ў Слуцк, да нас са Старобіна зачасцілі паліцаі: заходзілі ў кожны двор, шнарылі па хлявах, па скляпах, адбіралі ў людзей усё, што можна было альбо забраць сабе, альбо прадаць на кірмашы ды нажыцца. Нічым не грэбавалі: выносілі адзенне, абутак, ежу... Шчасце яшчэ, што сярод іх быў свой чалавек — Толік, сын аднаго з вяскоўцаў. Ён папярэджваў пра кожны налёт, людзі хавалі самае каштоўнае.

Але ж аднойчы паліцаі звaліліся, як снег на галаву, прычым зайшлі ў вёску з абодвух канцоў вуліцы, каб ніхто нікога папярэдзіць не мог, сталі рабаваць... Я сама гэта ўбачыла, бо якраз да кумы ішла... Павярнулася — і бягом дадому, да сваёй хацінкі. Адчыніла куфар, дастала вось гэтую хустку (больш нічога каштоўнага у нас не было) і думаю: што ж мне рабіць? Некуды вынесці яе ды схаваць — ужо не паспею... Дык я што, — спадніцу скінула, тараноўкай абкруцілася, наноў адзелася і стаю.

А паліцаі, чую, ужо ў сенцах. Усё чыста вытраслі з куфра, потым — перавярнулі ў хаце, схадзілі ў пусты хлеў, у пуню, але ж як ні шукалі, нічога для сябе не знайшлі: дзеці — самае дарагое — былі пры мне, а пасажная хустка — на мне...

Страху я тады нацярпелася! Прычым столькі, што паліцаі (пяць чалавек было) выйшлі, а я і вобзем: звалілася, як падкошаная, і слёзы ракой.

...Тараноўку з сябе толькі ноччу зняла, акуратна склала, загарнула ў чысты ручнік і схавала.

Паліцаі прыходзілі яшчэ некалькі разоў, шукалі, нават пыталіся, дзе мая «фабрычная хустка» (нейкая ж сволач падказала, што яна была!), але я кожны раз адказвала, што памяняла яе на хлеб для дзяцей».

...І тады, у юнацтве, упершыню пачуўшы гэту гісторыю, і потым, носячы прыгожую цёплую бабуліну тараноўку, я заўсёды помніла, якой жа цаной удалося яе захаваць!

**В. Бабко-Аляшкевіч,**
*Салігорскі раён.*

Усмешачку!

# НЕ ТЫЯ ЦЯПЕР СЫРКІ...

**Чэсь з Антосем, сябры-пенсіянеры, сышліся неяк пад вішнямі, добранька пасядзелі: выпілі, закусілі і на гэтым, на жаль, не спыніліся.**

Яшчэ раз вывернуўшы кішэні, яны стрэслі грошай на бутэльку віна і два плаўленыя сыркі. Чэсь, як чалавек маладзейшы, збегаў у краму. Факт, што «банкет» працягваўся далей. Адзінае... Віно было як віно, а вось закуска...

— Не, не тыя сталі сыркі! Ну зусім не тыя! — ледзь варочаў языком Антось. — Раней, помніш, — беленькія, пахучыя, смачныя. А цяпер? Глянь: рыжыя нейкія, крышацца... Ды вочы б такіх не бачылі!

Іх дзядзькі б не елі, калі б цвярозыя былі, калі б нешта іншае мелі, а так...

Што атрымалася, калі дрожджы — а гэта былі менавіта яны (у стаграмовых пачках) — уступілі ў рэакцыю з алкаголем і ўсім астатнім, гісторыя замоўчвае. Факт, што не пад вішнямі і не дома дзяды правялі другую палову дня і ладны кавалак ночы. Але гэта ўжо іншая гісторыя.

**А. Навасельская,**
*Мінскі раён.*